пластов. В его пространстве присутствуют голоса двух сестер, одна из которых «прошла» войну, другая ее «прожила». Третий голос – мой собственный, как родственницы и исследовательниц. В своей совокупности все три голоса отражают и три уровня истории: 1) официальную интерпретацию Войны, т.е. как мы ее теперь знаем из учебников или фильмов; 2) «свою» историю, переработанную и включенную в память личного опыта; 3) а также мою личную рефлексию по поводу первых двух вариантов и сформировавшейся собственной исторической картины.

В научном плане исследование помогло расширению и изменению образа прошлого через его повседневное восприятие.

**Использованные источники и литература**

1. Реброва И. В. «Женская» повседневность в проблемном поле истории Великой Отечественной войны // Российская повседневность в зеркале гендерных отношений: Сборник статей / Сост. Н. Л. Пушкарева. – М.: Новое литературное обозрение, 2013. С. 605-630.

2. Ушакин С. «Нам этой болью дышать»? О травме, памяти и сообществах / С. Ушакин // Травма:пункты: Сборник статей / Сост. С. Ушакин и Е. Трубина. – М: Новое литературное обозрение, 2009. - С. 5-41.

## НЕКАТОРЫЯ АСПЕКТЫ ПАРТЫЙНАГА КІРАЎНІЦТВА МІЛІЦЫЯЙ БЕЛАРУСІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ 1960 – 1980 гг.

Саракавік І. А. г. Мінск Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь

У сувязі з распадам СССР палітыкі і даследчыкі імкнуцца вызначыць прычыны гэтай з’явы, аб’ектыўна разабрацца ў савецкім дзяржаўным механізме, яго пабудове і дзейнасці, адносінах дзяржавы і грамадства. Не апошняе месца ў гэтым пераліку мае і праблема адносін Камуністычнай партыі да міліцыі, якая ў сілу спецыфікі сваіх функцый, пабудовы, дзейнасці па ахове грамадскага парадку і барацьбе са злачыннасцю займала асабліва важнае месца ў савецкім дзяржаўным механізме ўлады і кіравання. Гэтыя

адносіны можна разглядаць як партыйнае кіраўніцтва міліцыяй, органамі ўнутраных спраў (ОУС) у цэлым, з аднаго боку, так і якое месца ў дзейнасці партыі займалі праблемы міліцыі, з другога боку. Другі кірунак практычна не даследаваны гістарычнаю навукаю. Праблема ж партыйнага кіраўніцтва як міліцыяй, так і ОУС выклікала асаблівую зацікаўленасць савецкіх даследчыкаў, была запатрабавана ўладаю. Сёння гэта тэма шырока не даследуецца, асабліва савецкага часу. А яна заслугоўвае пэўнай навуковай увагі.

Нельга заніжать, але нельга і завышаць той ролі і значымасці партыі, якую яна адыграла ў эканамічным, асабліва індустрыяльным развіцці СССР, росце на пэўным этапе гістарычнага развіцця жыццёвага ўзроўню насельніцтва, магчымасці практычна ўсім жадаючым атрымаць адукацыю, у тым ліку і вышэйшую, і стаць высокакласнымі спецыялістамі, а таму і заняць больш высокі сацыяльны статус у дзяржаве і грамадстве. Адначасова нельга не заўважыць і другі бок дзейнасці партыі і звязаных з ёю інстытутаў дзяржавы, у тым ліку і міліцыі. Справа ідзе пра прavaадносіны ў грамадстве і краіне, якія прывялі да масавых парушэнняў правоў асобы і нават сацыялістычнай законнасці, якая аберагала ўладу бальшавіцкай партыі, рэпрэсіі ні ў чым не павінных людзей, устанаўленне манаполіі на ўладу, уласнасць, ідэалогію, праследаванне ўсіх тых, хто не прытрымліваўся афіцыйнай ідэалогіі і палітыкі, хаця і не парушаў сацыялістычнае заканадаўства.

Не меншую цікавасць выклікае пазнанне пытання наконт механізма адносін Кампартыі да міліцыі на рэспубліканскім ўзроўні, які намнога шырэй і глыбей, чым толькі партыйнае кіраўніцтва міліцыяй, а таксама таго месца, якое займалі праблемы міліцыі ў дзейнасці Кампартыі Беларусі. КП Беларусі як рэгіянальная частка КПСС з прававога пункту гледжання не з’яўлялася элементам механізма савецкай улады. Аднак у рэальнасці сам механізм такой улады не мог існаваць без партыі. Менавіта яна, а не прадстаўнічы орган, вызначала змест і кірункі дзеяння механізма ўлады, у тым ліку і міліцыі як састаўной часткі органаў унутраных спраў. У сутнасці, такой кампе-тэнцыяй валодала не сама партыя і нават не столькі яе прадстаўнічыя органы як з’езд, канферэнцыя ці пленум, а рабочыя органы ЦК РКП(б) – ВКП(б) – КПСС у асобе Палітбюро і Сакратарыята (адзін час і Аргбюро). Кіраванне ж такімі ключавымі сферамі жыццядзейнасці СССР, як замежныя справы, абарона,

дзяржаўная бяспека, ахова грамадская парадку і барацьба са злачыннасцю фактычна знаходзіліся па-за дзейснасцю ўрада, пад выключна непасрэдным кіраўніцтвам Палітбюро ЦК КПСС і Генеральнага сакратара ЦК КПСС. Асаблівае значэнне прыдавалася сістэме Міністэрства ўнутраных спраў. Не вы-падкова Генеральны сакратар ЦК КПСС, па сведчанню былога міністра ўнутраных спраў СССР А. У. Власава, у працэсе прызначэння яго на гэту пасаду на змену В. В. Федарчуку, заявіў, што міністр ўнутраных спраў СССР каштуе двух сакратароў ЦК КПСС [1, с. 39].

Адметнасцю Кампартыі Беларусі з'яўлялася тое, што яна не вызнача-ла стратэгію і тактыку развіцця праваахоўных органаў, міліцыі ў пры-вастнасці. Гэта была прэрэгатыва цэнтральнага органа – КПСС. КПБ як рэгіянальнай яе частцы прадвызначалася роля практычнага ажыццяў-лення кіраўнічых рашэнняў цэнтра, кантроля за іх рэалізацыяй і свое-часовага інфарміравання ЦК КПСС аб іх выкананні. Аднак і простым статыстам яна не вызначалася, асабліва ў пытаннях падбора кадраў.

Адметнасцю становішча міліцыі ў БССР, як і ў цэлым сістэмы ОУС рэспублікі, з'яўлялася тое, што як саюзна-рэспубліканская структура яна падпарадкоўвалася найперш непасрэдна цэнтру – МУС СССР і абавязкова выконвала ўсе яго загады і распараджэнні. Менавіта МУС СССР у межах сваёй кампетэнцыі ўстанаўлівала і магло адмяніць пасады, спецыяльныя званні, грашовае ўтрыманне супрацоўнікам і г.д. У той жа час МУС БССР падпарадкоўвалася непасрэда Савету Мініст-раў БССР. А паколькі фактычна, але не на аснове права, вышэйшым органам улады з'яўляўся ЦК КПБ, то найперш непасрэдна яму. Пры гэтым рашэнні МУС СССР мелі вяршэнства над рашэннямі мясцовых органаў улады. Аднак у рэальнай практыцы ўплыў апошніх на органы міліцыі, напрыклад, быў не меншы, чым МУС СССР, паколькі іх супрацоўнікі ў многім залежылі ад мясцовых органаў улады. Двайное падпарадкаванне міліцыі было замацавана нарматыўнымі актамі. Яно спатрэбілася партыі для таго, каб міліцыя не выйшла з-пад яе кантролю.

У адпаведнасці з арт. 126 Канстытуцыі СССР 1936 г. ВКП(б) высту-пала ў якасці "кіруючага ядра ўсіх арганізацый працоўных, як грамадс-кіх, так і дзяржаўных" [2, с. 744]. Арт. 6 Канстытуцыі СССР 1977 г. устанаўліваў, што "кіруючай і накіроўваючай сілаю савецкага грамадства, ядром яго палітычнай сістэмы, дзяржаўных і

грамадскіх арганізацый з'яўляецца Камуністычная партыя Савецкага Саюза". Яна "вызначае генеральную перспектыву развіцця грамадства, лінію ўнутра-най і знешняй палітыкі СССР, кіруе вялікай стваральнай дзейнасцю савецкага народа, надае планамерны, навукова абгрунтаваны характар яго барацьбе за перамогу камунізму" [3, с. 7]. Аналагічную норму ўтрымлівала і Канстытуцыя БССР 1978 г. [4, с. 6]. Гэтыя канстыту-цыйныя нормы замацавалі за Камуністычнай партыяй выключнае становішча ў органах дзяржаўнай улады СССР, у тым ліку і БССР. Сама па сабе яна не з'яўлялася органам дзяржавы – структурна-абасобленным звяном дзяржаўнага апарату з пэўнай кампетэнцыяй, паколькі не мела выразных яго прыкмет: утварэнне ва ўстаноўленных законам парадку, дзейнічанне ў пэўна вызначаных формах, ліквідацыя ва ўстаноўленым законам парадку, валоданне канкрэтнымі правамі і абавязкамі і г.д. Камуністычная партыя не пападала пад класіфікацыю органаў дзяржавы ні па прынцыпу падзелу ўладаў, ні па характару кампетэнцыі, ні па спосабу ажыццяўлення паўнамоцтваў [5, с. 536] і г.д. І не магла пападаць, бо яна з'яўлялася, па-першае, палітычнай партыяй і ўваходзіла ў палітычную сістэму грамадства. Па-другое, адметнасць яе ў тым, што яна захапіла дзяржаўную ўладу незаконным, не канстыту-цыйным шляхам, а шляхам узброенага палітычнага захопу ўлады, адсюль і яе далейшыя незаконныя дзеянні: усталяванне, па сутнасці, дыктатуры партыі, забарона дзейнасці іншых партый, у тым ліку і левага кірунку, што, натуральна, абмежавала яе сацыяльную апору. Ніякіх юрыдычных межаў яе ўлады канстытуцыйнае заканадаўства не прадугледжвала і не магло прадугледзіць, бо самі заканадаўцы былі "вінцікамі" ў сістэме ўлады, утворанай Кампартыяй. Па-трэцяе, уста-ляванне адзінай правячай партыі за кошт забароны ці ліквідацыі апазіцыйных партый заканамерна прывяло да яе зліцця з дзяржавай, і ў гэтым, менавіта, была адметнасць КПСС ад іншых партый свету.

Мэты і задачы КПСС, абмежаванасць сацыяльнай падтрымкі яе, унутранае і знешняе становішча краіны патрабавалі асаблівага падыходу партыі да савецкай міліцыі як адной з мадэлей паліцыі сацыялістычнай дзяржавы. У розныя гістарычныя перыяды ў залежнасці ад палітычнага, сацыяльна-эканамічнага становішча, крымінагеннага становішча яна ставіла канкрэтныя задачы міліцыі.

Хісткасць савецкай улады адразу пасля Кастрычніка 1917 г., яе першапачатковая нетрываласць застаўляла ўладу накіроўваць дзейнасць міліцыі не на ахову правоў грамадзян, не гледзячы на іх сацыяльны статус, а на падтрыманне так званай рэвалюцыйнай законнасці. Калі ў цывілізаваным грамадстве прынята лічыць, што закон – гэта кампраміс супрацьлеглых інтарэсаў. І таму закону павінна падпарадкоўвацца найперш сама дзяржава, яе розныя інстытуты, якія не павінны не толькі не выходзіць за межы закона, але і не дапусціць злоўжыванняў, абараніць грамадзяніна ад дзяржавы. Аднак рэвалюцыйная законнасць савецкай улады ўяўляла сабою прыярытэт правоў самой улады над правамі грамадзяніна, асабліва вышэйшага і сярэдняга саслоўяў. Той, хто не падзяляў поглядаў улады, лічыўся яе ворагам. Рэвалюцыйны грамадскі парадак, рэвалюцыйная законнасць, якой павінна была кіравацца савецкая міліцыя, мелі на ўвазе барацьбу найперш з ворагамі сацыялістычнай рэвалюцыі і савецкай улады. Да іх адносіліся не толькі буржуазія, былыя чыноўнікі самадзяржаўя і Часовага ўрада, а на тэрыторыі Беларусі – яшчэ і ўдзельнікі Першага Усебеларускага кангрэсу, стварэння і дзейнасці Беларускай Народнай Рэспублікі, не толькі тыя, хто не падзяляў поглядаў бальшавікоў, хаця і прытрымліваўся левай палітычнай плыні, але і дробныя ўласнікі. Зразумела, што да ворагаў савецкай улады прымяняліся і адпаведныя рэвалюцыйныя меры: расстрэл, астрог, канцэнтрацыйныя лагеры, высылка. Па Канстытуцыі БССР 1937 г. у адпаведнасці з арт. 106 ворагамі народа обвяшчаліся “асобы, квапіўшыяся на грамадскую, сацыялістычную ўласнасць” [6, с. 27]. Такая суровая мера, на думку заканадаўцаў, павінна была ўмацоўваць правячы рэжым, наводзячы страх на масы насельніцтва.

Каб такой пагрозы не існавала, трэцяя праграма КПСС, прынятая XXII яе з’ездам у 1961 г., “ставіла задачу забяспечыць строгае выканан-не сацыялістычнай законнасці, выкараненне ўсякіх парушэнняў права-парадку, ліквідацыю злачыннасці, ухіленне ўсіх прычын, яе нараджаю-чых”. Выхад вырашэння праблемы бачыўся найперш у “папярэджванні злачынстваў”, росце матэрыяльнай забяспечанасці, культурнага ўзроў-ню і свядомасці працоўных. Усё гэта ў канчатковым выніку павінна было прывесці да таго, каб “замяніць меры крымінальнага пакарання мерамі грамадскага ўздзеяння і выхавання” [7, с. 106]. Праходзіў час, а ліквідаваць

злачыннасць і прычыны, яе нараджаючыя, не ўдавалася. Наадварот, з цягам часу яна яшчэ больш нарастала. Таму Канстытуцыя БССР 1978 г. у арт. 59 замацавала абавязак грамадзян БССР "берагчы і ўмацоўваць сацыялістычную ўласнасць… змагацца з крадзяжамі і марнатраўствам дзяржаўнай і грамадскай маёмасці, беражліва адносіцца да народнага дабра". Аднак "асобы, якія рабілі замах на сацылістычную ўласнасць", ужо не абвяшчаліся ворагамі савецкага народа, а павінны былі "карацца па закону" [4, с. 22].

Першапачаткова злачыннасць у партыйных і дзяржаўных дакументах тлумачылася "радзімымі плямамі" капіталізму, затым "рэшткамі" капіталізму. І толькі ў канцы 1970-х – пачатку 1980-х г. жывучасць злачыннасці пачалі асцярожна аргументаваць памылкамі і недахопамі ў ходзе будаўніцтва сацыялізму з-за першапраходніцтва. Новая рэдакцыя трэцяй Праграмы КПСС, прынятая XXVII яе з'ездам у 1986 г., больш прызямлёна, рэальна ставіла задачу дзяржаўным органам, у іх ліку і ўнутраных спраў, міліцыі, "рабіць усё неабходнае для забеспячэння зберажэння сацыялістычнай уласнасці, аховы асабістай маёмасці, гонару і годнасці грамадзян, весці рашучую барацьбу са злачыннасцю, п'янствам і алкагалізмам, папярэджваць любыя правапарушэнні і ўхіляць нараджючыя іх прычыны" [8, 49]. Як бачна з вышэй прыведзе-ных актаў савецкай улады, з 1917 па 1991 г. адбылася эвалюцыя аб'екта міліцэйскай дзейнасці: ад ворага народа да злачынцы. Адсюль і розныя меры адносін і прымусу да іх. Змяніўся падыход улады і да прыроды злачыннасці: ад "радзімых плямаў", "рэшткаў" капіталізму да памылак і недахопаў у ходзе будаўніцтва сацыялізму.

У разглядаемы перыяд задачы міліцыі былі выкладзены ў дакумен-тах XXIV – XXVII з'ездаў КПСС. Дзейнасць праваахоўных органаў, у тым ліку і міліцыі, ацэньвалася ў іх неадназначна. Справа не толькі ў тым, што перамясціліся акцэнты непасрэдна да канкрэтных органаў правапарадку. Калі на XXIV і XXV з'ездах КПСС прыярытэт быў нададзены міліцыі, а затым пракуратуры, суду, органам юстыцыі, то на XXVI з'езде – першапачаткова органам юстыцыі, суда, а затым пракуратуры і савецкай міліцыі. Па асобных кірунках дзейнасці міліцыі прымаліся спецыяльныя дакументы ЦК КПСС, якія канкрэтызавалі рашэнні з'ездаў партыі.

Мясцовыя партыйныя органы, у іх ліку ЦК КПБ, абкамы, гаркамы, райкамы КПБ, з улікам перспектыўных і бягучых задач

КПСС валодалі добра адпрацаванай сістэмай працы па кіраўніцтву і кантролю за дейнасцю міліцыі Беларусі. Яна ўключала ў сябе канкрэтызацыю рашэнняў ЦК КПСС па важнейшых кірунках дзейнасці міліцыі па ахове грамадскага парадку і барацьбе з правапарушэннямі з улікам мясцовых адметнасцей, кантроль за іх выкананнем, падбор і расстаноўку кадраў, арганізацыю работы міліцэйскіх пярвічных партыйных арганізацый і парторганаў, правядзенне нарад, семінараў, канферэнцый па актуальных праблемах правапарадку і іншыя формы і кірункі дзейнасці.

Уся гэта праца арганізоўвалася, адсочвалася, аналізавалася, кантраля-валася аддзеламі адміністрацыйных органаў ЦК і абкамаў КПБ. У сваю чаргу аддзел знаходзіўся пад кіраўніцтвам другога сакратара ЦК КПБ, які адказваў перад партыяй найперш за працу па падбору і расстаноўцы кі-раўнічых кадраў рэспублікі, у тым ліку і ў сістэме МУС БССР, курыраваў такія ўстановы, як Беларуская ваенная акруга, КДБ БССР, МУС БССР, Спарткамітэт БССР, замяшчаў на час адсутнасці Першага сакратара ЦК КПБ. Гэта значыць, валодаў вялікімі ўладнымі паўнамоц-твамі. У апаратах абкамаў і асабліва ЦК Кампартыі Беларусі працавала шмат прафесіяналаў высокай кваліфікацыі, у тым ліку кандыдатаў і дактароў навук. У прыватнастці, у аддзелах адморганаў гэта былі, як праві-ла, юрысты па адукацыі, якія ведалі справу не столькі з кніг, колькі па сваёй ранейшай практычнай дзейнасці ў праваахоўных органах. Сам апарат функцыяніраваў на аснове строгай адказнасці: дысцыпліны перад вышэйшым партыйным кіраўніцтвам і гэтага патрабаваў ад кантралюемых органаў. У цэлым механізм выканання рашэнняў у ЦК КПБ дзейнічаў спраўна.

Уяўленне аб месцы праблем міліцыі ў дзейнасці ЦК Кампартыі Беларусі ў пэўнай ступені даюць звесткі аб разглядзе гэтых праблем у бюро і сакратарыяце ЦК КПБ, абкамаў партыі і ў бюро гаркамаў і райкамаў КПБ. У цэлым, па падліках аўтара, бюро і сакратарыят ЦК КПБ у перыяд з 1964 па 1985 г. разглядалі ў сярэднім па 2-3 праблемных пытанні ў год, а ў 1986 – 1990 гг. – 8-9, якія адносіліся да праблем міліцыі, грамадскага парадку і барацьбы са злачыннасцю. Гэта намнога больш, чым пытанняў іншых праваахоўных органаў разам узятых. Такі разгляд спраў у вышэйшым партыйным органе Беларусі пэўным чынам актывізаваў дзейнасць міліцыі на асобных кірунках, становіча ўплываў на вынікі

яе працы. Напрыклад, рост п'янства і алкагалізму ў рэспубліцы, негатыўны ўплыў іх на канфлікты ў сям'і, на прадук-цыйнасць працы, на псіхалагічны стан працоўных калектываў, рост правапарушэнняў вымусіў 19 ліпеня 1972 г. бюро ЦК КПБ прыняць "Мерапрыемствы па выкананню пастановы ЦК КПСС «Аб мерах па ўзмацненню барацьбы супраць п'янства і алкагалізму»" [9, арк. 9]. У іх Савету Міністраў БССР даручалася разглядзець і вырашыць пытанне аб адкрыцці ў абласцях лячэбна-працоўныя прафілакторыі для прымусовага лячэння хранічных алкаголікаў і злосных п'яніц. Праваахоўным органам даручалася распрацаваць і ажыццявіць канкрэтныя мерапрыемствы па ўзмацненню барацьбы з п'янствам і ўстанавіць кантроль за выкананнем заканадаўства, якое рэгулюе гандаль алкагольнымі напоямі [9, арк. 48, 49]. І хаця МУС БССР непасрэда не падпарадкоўвалася ЦК КПБ, але гэтае і іншыя рашэнні, даручэнні партыйных органаў абавязкова прымала да выканання.

Характэрным у гэтых адносінах з'яўлялася пастанова бюро ЦК КПБ "Аб сур'ёзных недахопах у рабоце апаратаў БКСУ Міністэрства ўнутранных спраў Беларускай ССР" ад 29 чэрвеня 1972 г. У ёй барацьба міліцыі з крадзяжамі сацыялістычнай уласнасці ў рэспубліцы была прызнана нездавальняючай. Галоўную прычыну бюро ЦК КПБ найперш бачыла ў тым, што "органы ўнутранных спраў і іх апараты БКСУ не даюць вострай палітычнай ацэнкі (падкрэслена аўтарам) распаўсюджанасці і шкоднасці гэтых з'яў, не прымаюць рашучых мер да ўзмацнення барацьбы з крадзяжамі сацыялістычнай уласнасці, хабарніцтвам і іншымі карыснымі злачынствамі" [10, арк. 10-11]. Аднак даваць палітычную ацэнку, не гаворачы ўжо аб "вострай", – гэта не кампетэнцыя міліцыі, а вышэйшых органаў улады. І таму гэта не магло быць віною міліцыі. Кожны дзяржаўны інстытут павінен строга выконваць свае функцыі, а не падмяняць сабою іншыя. Міліцыі інкрымініравалася адсутнасць сур'ёзных мер да карэннай перабудовы работы апаратаў БКСУ у святле патрабаванняў пастановы ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР ад 19 лістапада 1968 г. "Аб сур'ёзных недахопах у дзейнасці міліцыі і мерах па яе ўмацаванню". Адначасова ў пастанове ЦК КПБ правільна адзначалася, што многія з праводзімых аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў былі слабыя і таму не забяс-печвалі

своечасовага папярэджання і выяўлення злачынстваў. Апараты БКСУ дрэнна былі накіраваны на барацьбу з замаскіраванымі буйнымі крадзяжамі, бо займаліся ў асноўным дробнымі, бачымымі злачынствамі. Па гэтай прычыне гадамі дзейнічалі і заставаліся беспакаранными арганізаваныя небяспечныя групы раскрадальнікаў. Колькасць злачынстваў, выяўленых аператыўнымі супрацоўнікамі БКСУ, заставалася нізкай. У 1971 г. яна склала 55 % да агульнай колькасці зарэгістраваных карысных злачынстваў, а ў Магілёўскай, Віцебскай і Гомельскай абласцях – яшчэ менш. Справядлівы папрок у адрас МУС БССР быў зроблены на той аснове, што яно і яго органы на месцах пры падборы кадраў у апараты БКСУ дапусклі паспешнасць, часта ацэньвалі іх па фармальных, анкетных даных, слаба вывучалі прыгоднасць іх да службы ў міліцыі. Таму на работу ў яе траплялі часам людзі выпадковыя. Але механізм падбора кадраў не быў рэкамедаваны. Зноў жа правільна адзначалася, што папранейшаму асноўным крытэрыям ацэнкі дзейнасці апаратаў БКСУ служылі фармальныя паказчыкі работы, а не фактычны стан аховы народнага дабра ў гарадах і раёнах рэспублікі. Аднак эфектыўныя крытэрыі дзейнасці міліцыі ў пастанове не прапаноўваліся. Ставілася задача сумесна з органамі пракуратуры і юстыцыі абагульняць практыку ведамаснага кантроля за ўлікам і зберажэннем матэрыяльных каштоўнасцей; палепшыць папераджальна-прафілактычную работу па барацьбе з крадзяжамі і растратамі ў народнай гаспадарцы; умацаваць кіраўнічы склад падраздзяленняў БКСУ, правесці ў 1972 г. атэстацыю ўсіх супрацоўнікаў службы; карэнным чынам палепшыць ідэйна-выхаваўчую працу з асабовым складам, павысціць авангардную ролю камуністаў у аператыўна-вышуковай дзейнасці [10, арк. 11-13, 15-16].

Як сведчыць прыведзены дакумент, вышэйшае партыйнае кіраўніцтва БССР павышэнне эфектыўнасці барацьбы з замаскіраванымі крадзяжамі сацыялістычнай уласнасці і іншымі карыснымі злачынствамі бачыла ў паляпшэнні падбора кіруючага складу падраздзяленняў БКСУ, іх сталага камуністычнага светапогляду і маралі, г. зн. асабістых якасцей супрацоўнікаў міліцыі. Пры тым не ўскрываліся фактары, якія ўтваралі крымінагеннае становішча ў гэтай сферы, не аналізаваліся

матэрыяльна-тэхнічныя і фінансавыя магчымасці міліцыі, падрыхтоўка для яе высокакваліфікаваных спецыяльных кадраў. Таму вялікай аддачы ад гэтай пастановы не паследавала, хаця прыкметна ў параўнанні з ранейшым часам актывізавала дзейнасць апаратаў БКСУ.

Партыйныя камітэты БССР, найперш ЦК КПБ, прымалі рашэнні і па іншых кірунках дзейнасці міліцыі рэспублікі, рэалізуючы пры гэтым указанні ЦК КПСС ці па сваёй асабістай ініцыятыве. Такі падыход партыйных камітэтаў і арганізацый акцэнтаваў увагу кіраўнікоў прадпрыемстваў, арганізацый, устаноў, іх працоўныя і вучэбныя калек-тывы на неабходнасці барацьбы з правапарушэннямі, аказання дзейснай дапамогі ў гэтай справе міліцэйскім службам і падраздзяленням. У той жа час падкрэслівалася ўзрастаючая адказнасць міліцыі за падтрыманне належнага правапарадку. Аднак у цэлым агульныя заклікі партыйных камітэтаў па ўзмацненню барацьбы са злачыннасцю істотных станоўчых зрухаў не давалі. Яны мелі больш маральна-ідэалагічнае гучанне і ў такім кірунку ўздзейнічалі на пэўную частку супрацоўнікаў міліцыі, працоўных і служачых. Дзеля паляпшэння становішча барацьбы з правапарушэннямі хутчэй неабходны былі меры, падмацаваныя матэ-рыяльна-фінансава і кадрава. А паколькі іх не хапала, то акцэнт і рабіўся на маральна-ідэалагічныя якасці людзей.

Міліцыя падключалася ЦК КПБ дзеля вырашэння пэўных задач у розных сферах жыццядзейнасці. 29 верасня 1983 г. Камітэт народнага кантролю БССР паведамляў ЦК КПБ “Аб выніках праверкі стана аховы працы і тэхнікі бяспекі ў калгасах, саўгасах і на прадпрыемствах сельгастэхнікі Магілёўскай вобласці”. За 1982 г. з-за грубых парушэнняў эксплуатацыі сельскагаспадарчых машын, абсталявання рамонтных майстэрань і жывёлагадоўчых фермаў у гаспадарках вобласці адбылося 1355 няшчасных выпадкаў, шафёрамі і механізатарамі ажыццёўлена 133 дарожна-транспартных здарэнняў, у тым ліку ў нецвярозым стане – 50, загінула 47 чалавек, паранена 114. У сувязі з гэтым другі сакратар ЦК КПБ Г. Г. Барташэвіч даручыў, у прыватнасці, намесніку міністра ўнутраных спраў БССР П. С. Жуку “всеми своими средствами принять меры для устранения подобного” [11, арк. 92-94]. Ужо 18 кастрычніка 1983 г. МУС БССР паведамляла, што было зроблена ў вобласці:

адбыліся справаздачы кіраўнікоў сельгасарганізацый Кіраўскага, Клі-чаўскага раёнаў, аблмежкалгасбуда, сельгастэхнікі, сельгасхіміі на пасяджэнні абласнога аргкамітэта па правядзенню Усесаюзнага агляду бяспекі руху на транспарце; інфарміраванне абласных арганізацый аб стане аварыйнасці на падведамасным ім транспарце; праведзены гутаркі і сходы на тэмы бяспекі руху на дарогах і нагляд за рухам на сельскіх дарогах; рэйды па барацьбе з п’янствам [11. – арк. 100-102] і г.д. Хут-чэй гэта была адпіска. Яна і не магла быць іншай, бо праблемы, узнятыя ў запісцы КНК БССР, адносіліся хутчэй да гаспадарчых суб’ектаў, а затым толькі да міліцыі. І вырашэнне іх магчыма было эканамічнымі і сацыяльнымі метадамі. Міліцыя ж не магла вырашыць гаспадарчыя і сацыяльныя праблемы, паколькі гэта не яе сфера кампетенцыі.

Сістэма кіравання і кантроль партыйнымі камітэтамі за дзейнасцю міліцыі ўключалі ў сябе і аналіз дакументаў службаў і падраздзяленняў міліцыі. У прыватнасці, аддзел адміністраціўных органаў ЦК КПБ штогод аналізаваў ад 80 да 100 такіх матэрыялаў МУС БССР, а затым вяртаў іх міністэрству [12, арк. 1-129; 13, арк. 1-207]. Гэта дазваляла, з аднаго боку, быць у курсе важнейшых бягучых спраў міліцыі, адсочваць пэўныя тэндэнцыі як у міліцэйскім асяродку, так і ў злачынным свеце, параўноўваць даныя і факты міліцыі з крыніцамі іншых праваахоўных органаў і на гэтай аснове рабіць пэўныя высновы і прымаць больш аб’ектыўныя рашэнні. З другога боку, гэта сведчыла і пра тую вялікую ўвагу, якая надавалася дзейнасці міліцыі, падкрэслівалася яе значымасць у рэспубліцы і грамадстве.

Аб асаблівым месцы і ролі міліцыі ў дзяржаве і грамадстве сведчылі і перыядычныя справаздачы міліцэйскіх начальнікаў, супрацоўнікаў розных узроўняў аб выніках дзейнасці сваіх апаратаў, асабіста аб сваёй працы на пасяджэннях камітэтаў, бюро КПБ розных узроўняў. 16 чэрвеня 1967 г. у аддзеле адморганаў ЦК КПБ адбылася справаздача міністра аховы грамадскага парадку БССР камісара міліцыі 3 ранга А. А. Клімаўскіх аб працы з кадрамі ў святле выканання пастановы ЦК КПБ ад 22 лютага 1964 г. “Аб стане і мерах паляпшэння работы з кадрамі ў органах і падраздзяленнях МАГП БССР”. У выніку справаз-дачы і абмеркавання пытання была звернута ўвага міністра на неабход-насць павысіць якасны склад кадраў шляхам удасканалення сістэмы

іх спецыяльнай падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі, асаблівую ўвагу надаць маладым спецыялістам; узмацніць палітычную, выхаваўчую працу; праводзіць папераджальна-прафілактычныя мерапрыемствы па выкараненні прычын, якія нараджалі адмоўныя з’явы сярод супрацоўнікаў органаў МАГП БССР [14, арк. 237, 238].

У гады перабудовы, галоснасці, дэмакратыі, ідэалагічнага і палітычнага плюралізму, партыйныя камітэты і арганізацыі Беларусі дзеля актывізацыі чалавечага фактару на выніку дзейнасці сталі шырока ўкараняць у практыку працы такую форму, як справаздачы супрацоўнікаў міліцыі, пачынаючы ад міліцыянера і заканчваючы міністрам унутраных спраў БССР, перад камуністамі-супрацоўнікамі міліцыі на сходах пярвічных партыйных арганізацый, а таксама перад працоўнымі калектывамі. Толькі ў 1988 г. ў пярвічных партарганізацыях органаў унутраных спраў Беларусі былі заслуханы справаздачы 3244 камуністаў, у тым ліку 617 кіраўнікоў, зацверджаны 1174 партыйныя характарыстыкі. У кастрычніку-лістападзе 1988 г. адбылося 19,5 тыс. справаздач кіраўнічага і аператыўна-начальніцкага складу міліцыі перад амаль мільённай аўдыторыяй працоўных калектываў і насельніцтвам па месцу жыхарства [15, арк. 68, 69]. Такія справаздачы ў партыйных камітэтах, а яшчэ больш на сходах камуністаў пярвічных партарганізацый, перад працоўнымі калектывамі і насельніцтвам па месцу жыхарства дазвалялі супрацоўнікам міліцыі ў цэлым і іх начальнікам у прыватнасці лепш асэнсаваць свае поспехі і недахопы, адчуць рэакцыю на сваю дзейнасць з боку як партыйнага кіраўніцтва, так і працоўных калектываў, насельніцтва, вызначыць больш эфектыўныя формы, кірункі, сродкі і метады дзейнасці па ахове грамадскага парадку і барацьбе са злачыннасцю.

Істотны ўплыў партыйныя камітэты Беларусі на органы міліцыі, а праз іх і на ўвесь асабісты склад ажыццяўлялі праз разгалінаваную па вертыкалі і гарызанталі сістэму пярвічных партыйных арганізацый у іх, якія былі вобразна іх “вушамі і вачыма”, а таксама праз падбор і расстаноўку кадраў, іх вучобу. Практычна ў кожным падраздзяленні міліцыі існавала пярвічная партыйная арганізацыя. У залежнасці ад яе колькаснага складу выбіралася партбюро ці партком на чале с сакра-таром. У такіх вялікіх партыйных арганізацыях, як МУС БССР, УУС аблвыканкамў і Мінскага гарвыканкама, Мінская вышэйшая школа МУС СССР і іншых,

сакратар патбюро, не гаворачы пра сакратара парт-кома, мог быць вызваленай ад службы асобай і ўваходзіў у наменк-латуру адпаведнага РК, ГК, АК КПБ і нават ЦК КПБ. У прыватнасці, у 1985 г. ў сістэме МУС БССР існавала 683 пярвічныя партыйныя арга-нізацыі, у 8 з якіх былі партыйныя камітэты.

Партыйныя органы імкнуліся як мага больш павялічыць партыйную праслойку як у цэлым у ОУС, так асабліва ў аператыўна-службовых структурах міліцыі. У пэўнай ступені імі гэта задача была выканана. Калі ў 1966 – 1990 гг. сярод насельніцтва Беларусі партыйная праслойка складала ад 3,9 да 5,8 % [16, с. 14; 17, с. 14;18, с. 14-16; 19; 20, арк. 25], то сярод супрацоўнікаў органаў унутраных спраў у 1985 г. – 36,4 %, а ў 1986 г. – 37,3 % [21, арк. 100, 217, 226; 22, арк. 38]. У 1988 г. партыйнае ядро сярод атэставанага складу ОУС склала 39,8 %, а ў апе-ратыўных службах – яшчэ больш: крымінальнага вышуку – 61,2 %, ба-рацьбы з крадзяжамі сацыялістычнай уласнасці і спекуляцыяй – 79,0, следства – 64,1, участковых інспектараў міліцыі – 49,7 % [23, арк. 68]. У цэлым у шарэнгах партыі былі ў асноўным найбольш высока-прафесійныя супрацоўнікі міліцыі, хаця і з рознай матывацыяй уступлення ў яе шарэнгі.

Практычна, пачынаючы з начальніка аддзялення гаррайаддзела ўну-траных спраў і да міністра ўключна, начальніцкія пасады былі замеш-чаны членамі КПСС. Адны з іх сталі членамі партыі па сваіх поглядах, а значная частка, як паказалі падзеі 1990 – 1991 гг., уступіла ў члены КПСС дзеля свайго далейшага службовага росту, бо атрымаць пасаду нават начальніка аддзялення ў райаддзеле ўнутраных спраў практычна не было магчыма, калі ты не член партыі. Аднак, калі партыя фактычна па лета 1990 г. была правячай, то ўсе яе рашэнні, указанні партыйных работнікаў усімі выконваліся безагаворачна і ў тэрмін. І толькі пераход рэальнай улады ў 1990 г. ад ЦК КПБ да Вярхоўнага Савета БССР XII склікання рэальна выявіў, хто з'яўляецца ідэйным прыхільнікам КПСС – КПБ сярод камуністаў-супрацоўнікаў міліцыі. Такіх аказалася нямала, але яны не сталі падаўляючай большасцю.

З 1983 г. у сістэму МУС СССР, у тым ліку і МУС БССР, былі ўведзены палітаддзелы. Галоўны кірунак іх дзейнасці – гэта партыйна-палітычнае забеспячэнне праводзімых мерапрыемстваў, узмацненне партыйнага ўплыву на ўсе сферы і ўчасткі работы

органаў унутраных спраў, увязванне ўзаемасувязі партыйна-палітычнай работы з рашэннем аператыўна-службовых задач. Па сутнасці ставілася задача праз пярвічныя звенні партыі актывізаваць чалавечы фактар апаратаў міліцыі на барацьбу з ростам правапарушэнняў.

У разглядаемы перыяд дзейнічаў і інстытут уключэння начальнікаў міліцыі розных узроўняў па вертыкалі ў адпаведныя камітэты КП Беларусі. Міністры ўнутраных спраў БССР, як правіла, з’яўляліся членамі ЦК КП Беларусі, начальнікі ўпраўленняў унутраных спраў аблвыканкамаў – членамі абласных камітэтаў КПБ, а начальнікі гаррайаддзелаў унутраных спраў – адпаведна членамі ці нават членамі бюро ГК, РК КПБ.

Зразумела, як члены КПСС, члены адпаведных партыйных камітэтаў, са згоды якіх яны занялі адпаведную міліцэйскую пасаду, начальнікі міліцыі розных узроўняў найперш падпарадкоўваліся адпаведнаму партыйнаму камітэту, выконвалі найперш яго рашэнні. Яны поўнасцю залежалі ад партыйных камітэтаў. А гэта значыць, што праз сваіх начальнікаў і шараговыя супрацоўнікі міліцыі выконвалі найперш не закон, а рашэнні партыйнага камітэта, часцей за ўсё – сакратара РК, ГК, АК ці ЦК КПБ. Аднак гэта не азначае, што такія загады, даручэнні па сваёй сутнасці заўсёды былі антызаконныя. Але іх нельга назваць і правамернымі. Вядома, што, часам, партыйныя работнікі вусна аддавалі загады міліцэйскім начальнікам, якія нічога не мелі агульнага з дзяржаўнымі інтарэсамі: наконт кампраметацыі пэўнай асобы, незаконных сродкаў барацьбы з валацужнікамі і дармаедамі, прадастаўлення неслужбовай інфармацыі, нерасследавання “зацікаўленных” спраў і г.д.

Такая сістэма пры адноснай стабільнасці ў краіне і практычнай незмянальнасці кадраў пры Л. І. Брэжневе амаль 18 гадоў прыводзіла ў шэрагу рэгіёнаў краіны, часткова і ў Беларусі, да зрошчвання партыйных функцыянераў з начальнікамі, супрацоўнікамі міліцыі, что вяло да парушэння законнасці і правапарадку. Неабходна надаць належнае вышэйшаму партыйнаму кіраўніцтву БССР у асобе П. М. Машэрава, А. Н. Аксёнава, М. М. Слюнькова, якія своечасова прынцыпова адносіліся да такіх спраў, як “мінская”, “аршанская”, “брэсцкая”, “мазырская”, “віцебская”, атрымаўшых вялікі грамадскі рэзананс, і ў якіх былі замешаны

кіруючыя работнікі. Усе гэтыя справы ў той ці іншай ступені былі разгледжаны ў ЦК КПБ і атрымалі негатыўную ацэнку, але ў ЦК КПБ не быў атрыманы поўны адказ: чаму сталі магчымыя такія справы, тым больш, што гэта не выключэнне, а станавілася правілам, тэндэнцыяй? Такі адказ неабходна бачыць як у самой прыродзе савецкай сістэмы ўлады і гаспадарання, так і ў самой прыродзе чалавека. Аднак крытычна ставіцца да прыроды савецкай улады нікому не дазвалялася, нават ЦК КПБ.

Аналіз архіўнага матэрыяла і рэальнай практыкі міліцыі паказвае, што не толькі партыйныя органы накіроўвалі, кантралявалі дзейнасць ОУС, звярталіся да іх, падкрэсліваючы тым самым іх ролю і месца ў механізме дзяржавы, але і органы міліцыі, у сваю чаргу, часта звярталіся да партыйных камітэтаў і бюро рознага ўзроўню з дакладамі, інфармацыяй аб выкананні пэўных даручэнняў, становішчы спраў па ахове грамадскага парадку і барацьбе са злачыннасцю, просьбамі вырашэння кадравых пытанняў, уздзейнічання на іншыя органы кіравання па пытаннях аховы сацыялістычнай уласнасці, барацьбы з асобнымі відамі правапарушэнняў і іншымі праблемамі, вырашэнне якія было ў сферы рэальна склаўшайся кампетэнцыі парткамітэтаў.

МУС БССР інфарміравала ЦК КПБ практычна аб усіх выпадках забойства, выкарыстання вогнестрэльнай зброі, крадзяжу сацыялістычнай уласнасці, злоўжывання сваім становішчам службовымі асобамі і г.д. З інфармацыяй, запіскамі, дакладнымі, справаздачамі знаёміліся сакратары ЦК КПБ, адказныя супрацоўнікі партыйнага апарату. І ў гэтым сэнсе міліцыя выступала своеасаблівымі “вушамі” і “вачыма” ЦК КПБ, іншых партыйных органаў, паколькі такі парадак існаваў па ўсёй вертыкальнай лесвіцы, пачынаючы з раёна і заканчваючы рэспублікай. Гэта давала магчымасць партыйным камітэтам валодаць усёй паўнатой інфармацыі па ўсіх аспектах жыццядзейнасці раёна, горада, вобласці, рэспублікі. Стала правілам, што вынікі працы ОУС рэспублікі за кожны год паведамляліся ЦК КПБ, Прэзідыуму Вярхоўнага Савета БССР і Савету Міністраў БССР [24, арк. 78]. На працягу года найбольш матэрыялаў па розных аспектах дзейнасці міліцыі накіроўвалася менавіта ў вышэйшы парторган. Аналіз 97 матэрыялаў, накіраваных МУС БССР у 1966 г. ЦК КПБ, паказвае, што ў асноўным яны

адлюстроўвалі праблемы крадзяжу сацыялістычнай уласнасці – 23 з іх, хуліганства – 9, дарожна-транспартных здарэнняў (ДТЗ), пажараў – па 7, забойстваў, а таксама дакладныя запіскі – па 6, самазабойстваў міліцыянераў – 5, нападзення на міліцыянераў, спекуляцыі – па 4 і іншыя, уключаючы і 2 інфармацыі аб антысавецкай дзейнасці [12, арк. 1-229]. У наступныя гады змястоўнасць інфармацыі МУС БССР ЦК КПБ практычна не змянілася. У 1970 г. з 80 матэрыялаў 16 прыпадала на пытанні крадзяжу сацыялістычнай уласнасці, 12 – на дакладныя запіскі, спраўкі, 9 – на пытанні ДТЗ, па 6 – на выпадкі хабарніцтва, скаргі на міліцыю, па 5 – на пытанні спекуляцыі, хуліганства, па 3 – забойстваў, нападзенняў на міліцыянераў [13, арк. 1-207] і іншыя. Аднак ні адна інфармацыя не была спецыяльна прысвечана правапарушэнням адносна асабістай уласнасці грамадзян, хаця, напрыклад, у гэтыя гады крадзёж асабістай маёмасці грамадзян быў у два разы большы, чым дзяржаўнай і грамад-скай. Значыць, савецкая дзяржава найперш абараняла і клапацілася пра свае інтарэсы, затым – грамадства і толькі пасля гэтага – асобы.

З такога масіву інфармацыі кіраўніцтва ЦК КПБ асабліва цікавілі асобныя факты. МАГП БССР 5 студзеня 1966 г. інфарміравала сакратара ЦК КПБ П.М. Машэрава аб тым, што аддзел міліцыі Капыльскага райвыканкама сумесна з аддзелам БКСУ УАГП Мінскага аблвыканкама прыцягвае да крымінальнай адказнасці за крадзёж дзяржаўных грашовых сродкаў старшыню добраахвотнага сельскага спартыўнага таварыства “Ураджай” Капыльскага раёна, кандыдата ў члены КПСС Пінчука, які ў 1955 г. быў судзімы за ўдзел у грабяжах да 15 гадоў пазбаўлення волі. П. М. Машэраў наклаў 8 студеня рэзалюцыю: “Секретарям ЦК и т. Полозову Н. Н. Желательно разобраться, каким образом он оказался в партии” [12. – Арк. 7]. Чысціня радоў партыі для П. М. Машэрава была найвышэй за ўсё. Зразумела, што злодзеі не павінны былі быць у партыі. Але цяжка пагадзіцца з тым, што яны маглі займаць такія пасады. А згоду на гэта даваў райкам партыі. У другіх выпадках адсутнічала рэакцыя сакратароў ЦК КПБ. 23 чэрвеня 1966 г. на аўтамагістралі Брэст – Мінск у ДТЗ загінуў старшыня Камітэта народнага кантролю Брэсцкай вобласці С. А. Мядзведзяў з-за грубага парушэння правілаў дарожнага руху яго шафёрам, які быў цяжка паранены. На гэтай дакладной міністра аховы грамадскага

парадку БССР П. М. Машэраў толькі зазначыў: “Секретарям ЦК” і подпіс [12. –Арк. 81]. Падобныя выпадкі парушэнняў правілаў дарожнага руху шафёрамі наменклатурных работнікаўназіраліся і раней, і пасля гэтага здарэння. Іх служба ДАІ практычна не карала з-за заступніцтва іх начальнікаў. У рэшце рэшт гэта каштавала жыцця і многім вядомым людзям не толькі рэспублікі, але і ўсяго СССР – Ф. А. Сурганаву, Л. І. Бядзе, самому П. М. Машэраву і іншым. Аднак істотных высноў з гэтага не было зроблена. Міліцыя была бяссільная, бо аб’ектам правапарушэнняў былі самі прадстаўнікі ўлады. Калі ж справа тычылася сацыялістычнай уласнасці, рэзалюцыі вышэйшых партыйных работнікаў заўсёды былі адраснымі і прапаноўвалі прыняцце неадкладных мераў. 19 студзеня 1966 г. МАГП БССР паведамляла ЦК КПБ, што сумесна з Беларускім рэспубліканскім саветам прафсаюзаў быў праведзены рэйд праверкі аховы і зберажэння сацыялістычнай уласнасці на прадпрыемствах і ў арганізацыях БССР, які выявіў цэлы шэраг недахопаў у гэтай справе. Вынікі рэйда былі дакладзены выканкамам мясцовых Саветаў дэпутатаў працоўных, адпаведныя прадстаўленні былі зроблены міністэрствам і ведамаствам БССР. Строгая рэзалюцыя П. М. Машэрава: “Ознакомить членов и к-тов в чл. Президиума ЦК. Отделам ЦК проследить за принятием необходимых мер по линии соответствующих министерств и ведомств республики” [12, арк. 10-15].

Вышэйшае партыйнае кіраўніцтва БССР строга ставілася да парушэння законнасці супрацоўнікамі міліцыі, перавышэння ўладных паўнамоцтваў, выпівак у рабочы час, выкарыстанне службовага становішча ў карысных мэтах. Толькі за 1982 – 1983 гг. было асуджана за парушэнне сацыялістычнай законнасці і іншыя злачынства 98 супрацоўнікаў міліцыі, у тым ліку 36 – за рукапрыкладства. Звольнена па службовай неадпаведнасці звыш 1 тыс. чалавек, каля 3 тыс. прыцягнуты да дысцыплінарнай адказнасці. Улічваючы падобныя факты, бюро ЦК КПБ 9 снежня 1983 г. разглядзела пытанне “Аб фактах грубага парушэння сацыялістычнай законнасці супрацоўнікамі праваахоўных органаў рэспублікі” [12, арк. 28, 25]. За дапушчаныя грубыя парушэнні законнасці, слабае кіраўніцтва органамі ў пытаннях умацавання супрацоўнікамі службовай дысцыпліны бюро ЦК КПБ члену КПСС, міністру ўнутраных спраў БССР абвясціла строгую вымову з

занясеннем ва ўліковую картку і вызваліла яго ад пасады міністра. Такое пакаранне атрымаў і першы намеснік міністра. Адпаведныя партыйныя пакаранні і вызваленне ад пасад былі ўчынены да начальніка Мазырскага гаррайаддзела і яго намесніка, трох супрацоўнікаў крымінальнага вышуку гэтага жа аддзела. Апошнія былі прыцягнуты да крымінальнай адказнасці [25, арк. 28, 29, 31]. Больш істотныя недахопы ў дзейнасці праваахоўных органаў былі выяўлены на пасяджэнні бюро ЦК КПБ 24 верасня 1986 г., калі разглядалася пытанне “Аб грубых парушэннях сацыялістычнай законнасці, дапушчаных работнікамі праваахоўных органаў пры расследаванні і разглядзе ў судах шэрагу цяжкіх злачынстваў, ажыццёўленых у Віцебскай вобласці”. Там на працягу 15 гадоў беспакаранна здзяйсняў забойствы жанчын Міхасевіч Г. М. За яго злачынствы ў розныя гады незаконна былі прыгавораны судамі да суровай меры пакарання 12 невінаватых грамадзян, у тым ліку Цярэня Н.С. – да смяротнай кары. Вінаватыя ў гэтай справе, найперш усе вышэйшыя кіраўнікі праваахоўных органаў БССР, панеслі суровыя пакаранні: выключаны з партыі, зняты з пасадаў. Партарганізацыямі Віцебскай вобласці і г. Мінска былі прыцягнуты да строгай партыйнай адказнасці 69 камуністаў-супрацоўнікаў праваахоўных органаў, 13 з іх выключаны з КПСС. Пракуратурай СССР і Пракуратурай БССР, МУС БССР пакарана ў дысцыплінарным парадку 11 супрацоўнікаў; звольнена з органаў і адклікана са складу судоў 23 чалавекі [25. – арк. 20].

Усе гэтыя шматлікія факты і многія партыйныя дакументы сведчаць аб тым, што кіруючыя органы за прычыну часта прымалі яе наступствы. Так было выгадна, бо асноўная прычына крылася ў прыродзе савецкай сацыялістычнай сістэмы ўлады, якая не ведала іншых шляхоў па ахове грамадскага парадку і барацьбе са злачыннасцю. Партыя патрабавала ажыццяўляць, хоць і сацыялістычную, але законнасць. Але на самой справе менавіта партыйны орган, а не вышэйстаячы дзяржаўны, прымаў кадравае рашэнне. Гэта, па-першае, з’яўлялася не толькі парушэннем савецкага заканадаўства, але нават і рашэння Палітбюро ЦК КПСС ад 20 лістапада 1986 г. Па-другое, адміністрацыйныя меры, як правіла, ніколі не вырашаюць сутнасць праблемы, а заганяюць яе яшчэ больш унутр, пасля чаго яе вырашэнне становіцца больш цяжкім. Па-трэцяе, сутнасць справы ў многім заключалася ў

вызначэнні крытэрыяў эфектыўнасці дзейнасці міліцыі. У разглядаемы перыяд ім быў працэнт раскрывальнасці злачынстваў супрацоўнікамі міліцыі. За высокі працэнт начальства магло ўзнагародзіць, а за дрэнны – пакараць. У сувязі з такім падыходам супрацоўнікі міліцыі вымушаны былі ці пакінуць ОУС ці, часам, ісці на заведамае парушэнне законнасці, “выбіваючы”, “выкалачваючы” living рознымі супрацьпраўнымі прыёмамі неабходныя для іх доказы віны ў падазроных. Па-чацвёртае, многія партыйныя дакументы былі навеяны небяспечнай ілюзіяй, што са злачыннасцю можна хутка і лёгка пакончыць. Дзеля гэтага дастаткова было толькі прыняць чарговую пастанову з патрабаваннямі ў ёй “узмацніць”, “палепшыць”, “удасканаліць”, “прыняць меры”. Разлік браўся і на маральны аспект, унутраныя магчымасці супрацоўнікаў міліцыі рознага ўзроўню. Але яны з’яўляюцца далёка не невычарпальнымі. На ўсё існуе мяжа магчымасці, пасля якой адбываецца разбурэнне, у тым ліку і маральнага стану асобы супрацоўніка міліцыі.

Такім чынам, прыведзены факталагічны матэрыял дазваляе заклю-чыць, што ў разглядаемы перыяд менавіта КПСС вызначала генераль-ную палітыку стратэгіі і тактыкі дзейнасці міліцыі СССР у цэлым, а гэта значыць і міліцыі БССР як рэгіянальнай яе часткі, па ахове грамадскага парадку і барацьбе са злачыннасцю, гарызантальную і вертыкальную структуру ОУС, сістэму кіравання ёю, кадравую палітыку. Кампартыя Беларусі і яе мясцовыя партыйныя органы імкнуліся старанна выконваць палітыку КПСС адносна мясцовых умоў, вызначалі ў рэчышчы гэтай палітыкі свае формы і метады работы з міліцыяй, кантроль за яе дзейнасцю. Партыя разглядала міліцыю як адзін з важнейшых інструментаў механізма дзяржавы дзеля замацавання, утрымання і ўзмацнення сваёй улады. Менавіта таму яна заўсёды надзяла міліцыю, асабліва ў складаныя, пераломныя перыяды гісторыі, вялікімі паўнамоцтвамі, а таму і вялікай падтрымкай са свайго боку.

З другога боку, міліцыя верай і праўдай служыла савецкай сістэме ўлады, якая яе стварыла, накіроўвала і кантралявала. Адметнасцю партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва вышэйшай партыйнай эліты Беларусі дзейнасцю рэспубліканскай міліцыяй стаў персанафіцыраваны кірунак, які праяўляўся праз прызначэнні міністра ўнутраных спраў рэспублікі. У азначаны перыяд імі былі:

А. Н. Аксёнаў, Б. Ц. Шумілін, А. А. Клімаўскі, Г. М. Жабіцкі, В. А. Піскароў, У. Д. Ягораў. Аб’ектыўна ўсе яны сваю дзейнасць імкнуліся выконваць старанна, прафесійна. Калі адны падыходзілі да дзейнасці міліцыі больш з партыйна-дзяржаўных пазіцый, то другія, прайшоўшы міліцэйскую службу знізу да самага верху, не ігнаруючы партыйна-дзяржаўны падыход, – больш з міліцэйскіх пазіцый, што аказвала больш станоўчы ўплыў на дзейнасць усёй міліцыі рэспублікі. Міліцыя Беларусі найперш выконвала рашэнні КПСС – КПБ і толькі затым – законы.

Адначасова неабходна падкрэсліць, што дзеянне партыйных арганізацый і іх органаў у сістэме МУС БССР у разглядаемы перыяд мела станоўчае значэнне, актывізавала дзейнасць супрацоўнікаў міліцыі на эфектыўную ахову грамадскага парадку і барацьбу са злачыннасцю. Яны служылі своеасаблівым стрымліваючым фактарам ад непамерна прадузятых, а часам і неправамерных дзеянняў асобных начальнікаў на ўсіх узроўнях. Партыйнае спагнанне рэзка негатыўна адбівалася на іх кар’еры. Партыйныя арганізацыі ў многім абаранялі інтарэсы шараговых супрацоўнікаў міліцыі.

**Выкарыстанныя крыніцы і літаратура**

1. Некрасов, В.Ф. МВД в лицах. От В. В. Федорчука до А.С. Куликова. 1982 – 1998 / В. Ф. Некрасов. – М. : Молодая гвардия, 2000. – 359 с.

2. История Советских Конституций (в документах). 1917 – 1956. – М. : Госюриздат, 1957. – 1046 с.

3. Конституция (Основной Закон) Союза Советских Социалистических Республик. – М. : Политиздат, 1977. – 127 с.

4. Канстытуцыя (Асноўны Закон) Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. – Мінск : Беларусь, 1978. – 61 с.

5. Вишневский, А.Ф. Общая теория государства и права / А. Ф. Вишневский, В. А. Кучинский, Н.А. Горбаток. – Минск : Тесей, 1998. – 576 с.

6. Канстытуцыя (Асноўны Закон) Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. – Менск : Белпартвыдавецтва ЦК КП(б)Б, 1937. – 27 с.

7. Программа Коммунистической партии Советского Союза. Принята XXII съездом КПСС. – М. : Политиздат, 1967. – 144 с.

8. Программа Коммунистической партии Советского Союза. Новая редакция. Принята XXVII съездом КПСС. – М. : Политиздат, 1986.

9. Нацыянальны Архіў Рэспублікі Беларусь (далей – НАРБ). – Фонд. 4. – Воп. 81. – Спр. 2421.

10. НАРБ. – Фонд 4. – Воп. 81. – Спр. 2417.

11. НАРБ. – Фонд 4. – Воп. 151. – Спр. 36.

12. Архіў МУС Рэспублікі Беларусь (далей – Архіў МУС РБ). – Ф. 25. – Воп. 1. – Спр. 105.

13. Архіў МУС РБ. – Спр. 124.

14. Архіў МУС РБ. – Спр. 108.

15. Архіў МУС РБ. – Спр. 157.

16. Народное хозяйство Белорусской ССР в 1986 г.: статистический ежегодник. – Минск : Статистика, 1987. – 275 с.

17. Народное хозяйство Белорусской ССР в 1989 г.: статистический ежегодник. – Минск : Беларусь, 1990. – 271 с.

18. Коммунистическая партия Белоруссии. – Минск : Беларусь, 1981. – 143 с.

19. НАРБ. – Фонд 4. – Воп. 134. – Спр. 35.

20. НАРБ. – Фонд 4. – Воп. 160. – Спр. 1139.

21. Архіў МУС РБ. – Фонд 34. – Воп. 1. – Спр. 7.

22. Архіў МУС РБ. – Спр. 80.

23. Архіў МУС РБ. – Фонд 25. – Воп.1. – Спр. 157.

24. Архіў МУС РБ. – Спр. 125.

25. НАРБ. – Ф. 4. – Воп. 150. – Спр. 115.

## ПАРТИЯ В СИСТЕМЕ СОВЕТСКОГО ГОСУДАРСТВА

Семенова Л. Н. г. Минск, БНТУ

Власть и управление в любые периоды истории, включая советский, крайне плохо поддаются теоретическому осмыслению в терминах западной политологии. Между тем для характеристики Советского Союза в общественно-политическом, научном и учебном дискурсе продолжают употребляться понятия «тоталитаризм», «однопартийная система», «партия-государство», «диктатура партии», «партократия».

РКП (б) – ВКП(б)–КПСС, включавшая КПБ и другие республиканские отряды, не была политической партией классического за-